***Маўленчая размінка.*** Прачытайце верш Васіля Жуковіча «Зямля».

Выразна і правільна вымаўляйце гукі [дж], [ч], [ц’], [ў], [г] і падоўжаны [н’].

**Гляджу** з захапле**нн**ем
на нашу зямлю.
У травах і красках
зямліцу люблю,
і **ў цё**плых завеях
барвовых лісто**ў**,
і **ў ці**шы прасторнай
бухматых сняго**ў**.
Як за**ч**араваны
**гляджу** на зямлю.
За тое, што ба**ч**у,
яе **ў**жо люблю.

**Бухма́ты** — пушысты, махнаты.
**Ірдзе́ць** — рэзка вылучацца сваім ярка-чырвоным колерам; чырванець.

## Люблю

*(Скарочана)*

*Канстанцыя Буйло*



Люблю наш край — старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз спазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

Люблю народ наш беларускі
І хаты ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых га́яў і лясоў.



Правообладатель Академия образования

І рэчку, што імкліва воды
Імчыць у нязведаную даль,
І схілы берагоў пясчаных,
І яснасць чыстых яе хваль.

Люблю вясну, што ў кветкі, зелень
Аздобіць радасна зямлю,
Буслоў на гнёздах клекатанне
І спеў жаўраначка люблю.

Гарачую спякоту лета
І буру летнюю з дажджом,
Як гром грыміць, а ў чорных хмарах
Маланка зіхаціць агнём.

І восень сумную люблю я,
І першы звон сярпоў і кос,
Як выйдуць жнеі збожжа жаці,
А касары — на сенакос.

Люблю зіму з яе марозам,
Што вокны прыбярэ ва ўзор,
І белы снег, што, укрыўшы поле,
Ірдзіцца бляскам ясных зор.



...І песню родную люблю я,
Што ў полі жнеі запяюць,
Як гукі звонкія над нівай
Пераліваюцца, плывуць.

Мне тут усё для сэрца міла,
Бо я люблю край родны свой,
Дзе з першым шчасцем я спазналась
І з першай горкаю слязой.

?

1. Якія пачуцці перадаюцца ў вершы?
2. За што паэтэса любіць родны край? Пералічыце.
3. Патлумачце, як вы разумееце сэнс выразаў:
   - Залочаныя збожжам нівы;
   - Люблю зіму з яе марозам,
     Што вокны прыбярэ ва ўзор;
   - І белы снег, што, укрыўшы поле,
     Ірдзіцца бляскам ясных зор.
4. Якое слова і дзеля чаго паўтарае паэтэса амаль у кожным чатырохрадкоўі верша?
5. Чаму Канстанцыя Буйло любіць усе прыродныя з'явы і поры года? Як гэта характарызуе паэтэсу?
6. Верш «Люблю» напісаны больш за сто гадоў таму назад. Якія радкі сведчаць пра даўно мінулы час?
7. Падрыхтуйцеся да конкурсу на лепшага чытальніка верша «Люблю».
8. Распытайце ў сваіх бацькоў, дзе яны нарадзіліся, выраслі. За што яны любяць свой родны край?



Правообладатель Академия образования

## *У свеце прыгожага*

**1. Паслухайце песню «Люблю наш край».** Ці спадабалася яна вам? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі. Якія вобразы, карціны ўзнікалі перад вашымі вачыма, калі вы слухалі песню?

**2. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны Уладзіміра Жданава «Палессе. Вясна на хутары».**



**3. Адкажыце на пытанні.**

1) Чаму на карціне пераважаюць сінія і зялёныя фарбы?

2) Прыдумайце іншую назву карціне. Чаму вы хочаце назваць яе так? Аргументуйце.

3) Якія радкі верша Канстанцыі Буйло «Люблю» сугучны з творам жывапісу Уладзіміра Жданава? Знайдзіце і прачытайце іх.